**Литература**

1 Ляпон, М. В. Модальность / М. В. Ляпон // Лингвистический энциклопедический словарь / под ред. В. Н. Ярцевой. – М. : Советская энциклопедия, 1990. – С. 303–304.

2 Словарь русского языка: в 4 т. / гл. ред. А. П. Евгеньева. – М. : Русский язык, 1981–1984.

3 Быкова, А. А. Образная интерпретация явлений психической сферы: метафоры с семантикой температурных изменений / А. А. Быкова // Вестник Томского государственного ун-та. – 2011. – № 348. – С. 11–14.

**УДК 94(73)**

***Я. С. Ермакоў***

## ПРЫНЯЦЦЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ СІМВАЛАЎ КАНФЕДЭРАЦЫІ І ЗАВЯРШЭННЕ ЯЕ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

*Артыкул прысвечаны разгляду распрацоўцы і прыняццю дзяржаўных сімвалаў Канфедэрацыі, якая ўсталявалася на Поўдні ЗША яшчэ да Грамадзянскай вайны. Таксама ў артыкуле аналізуецца завяршэнне тэрытарыяльнай арганізацыі дадзенага дзяржаўнага ўтварэння, якое ішло праз другую хвалю сецэсіі і барацьбу за памежныя штаты.*

Пасля першай хвалі сецэсіі і абвяшчэння Канфедэратыўных Штатаў Амерыкі неабходна было вызначыць напрамкі дзейнасці па завяршэнню канстытуцыйнай арганізацыі краіны. Таму яшчэ да Грамадзнскай вайны была прынята Канстытуцыя КША, вызначаны і абраны асноўныя галіны ўлады. Неабходна было таксама вызначыць сталіцу, сцяг, пячатку, дэвіз і гімн краіны, а таксама скончыць яе тэрытарыяльную арганізацыю, бо значная частка паўднёвых штатаў былі па-за межамі КША. Апошнім двум напрамкам і прысвечаны дадзены артыкул.

Напрацягу чатырох год існавання КША сталіцамі дадзенага дзяржаўнага ўтварэння былі аж тры гарады – Мантгомеры, штат Алабама (з 4 лютага па 29 мая 1861 года), Рычманд, штат Вірджынія (з 29 мая 1861 г. па 3 красавіка 1865 года) і Данвілл, таксама Вірджынія (з 3 па 10 красавіка 1865 года) [1, с. 14–15]. Мантагомеры стаў сталіцай таму, што менавіта тут адбылося абвяшчэнне КША і сюды потым з'ехаліся ўсе афіцыйныя асобы краіны. Аднак пасля пачатку вайны пайшла другая хваля сецэсіі, падчас якой Вірджынія – найбольш эканамічна развіты штат сярод атстаніх – таксама выйшла з Саюза. Як адзначыў Дж. Макферсан, «Вірджынія забяспечвала Канфедэрацыю каштоўнымі рэсурсамі. Штат быў самым густанаселеным на Поўдні, а прамысловыя магчымасці практычна былі супастаўнымі з тымі, якія былі ў сямі першых штатах Канфедэрацыі разам узятыя. Жалезавырабляючы завод Трыдэгарда ў Рычмандзе быў адзіным прадпрыемствам, які быў здольны выпускаць цяжкія артылерыйскія гарматы» [2, p. 333]. Рыманд быў лепей за Мантгомеры і тым, што ён быў больш за апошняга і меў лепей арганізаваную інфраструктуру. Таму, 11 мая 1861 года Часовы Кангрэс прыняў рашэнне аб пераносе сталіцы Канфедэрацыі з Мантгомеры ў Рычманд [1, с. 15].

Складаней было з астатнімі дзяржаўнымі сімваламі, асабліва са сцягам. 9 лютага 1961 года быў утворны Камітэт сцяга і пячаткі, які прапанаваў у якасці афіцыйнага сцяга Канфедэрацыі сцяг «Зоркі і палосы» [3, p. 5]. Гэты сцяг меў сем палос, якія сімвалізавалі сем першых штатаў КША. Яго і зацвердзілі 4 сакавіка 1861 года [4, p. 4]. Аднак ужо падчас вайны на сцягу з'явілася яшчэ шэсць зорак, стала ўжо цяжка



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адрозніваць яго ад сцяга ЗША. Таму было прынята рашэнне аб стварэнні новага баявога сцяга Канфедэрацыі – «Паўднёвы Крэст» [1, с. 18]. Ён прадстаўляў з сябе сіні дыяганальны крэст з трынаццаццю белымі зоркамі на чырвоным фоне. Было сторана некалькі відаў сцяга для розных падраздзяленняў войск [4, p. 4].

1 мая 1863 года быў прыняты новы дзяржаўны сцяг, які паводле выпадку атрымаў назву «сцяг Джэксана» [3, p. 12]. Дадзены сцяг прадстаўляў з сябе белае поле з чырвонай акантоўкай, на якім быў змешчаны сіні дыяганальны крэст з белай акантоўкай і трынаццаццю белымі зоркамі [4, p. 4]. Але ён быў непапулярны, таму амаль што ў канцы вайны, 4 сакавіка 1865 года, быў зменены на іншы: была дадана чырвоная вертыкальная паласа на правай частцы, а белая частка сцяга была скарочана [3, p. 15].

Прасцей было з гімнам Канфедэрацыі. Афіцыйна ён не быў зацверджаны, аднак сярода людзей мела папулярнасць песня «Дзіксі», якая была напісана ў канцы 1850-х гадоў Д. Д. Эмметам, выхадцам са штата Агаё. Ужо падчас вайны «Дзіксі» стаў сапраўдным нацыянальным гімнам краіны [1, с. 17].

Адзначаны Камітэт таксама прапанаваў у якасці пячаткі выяву статуі Дж. Вашынгтона, акружанай вянком з аснойных гаспадарчых культур краіны, з надпісам «Канфедэратыўныя штаты Амерыкі: 22 лютага 1862» і з дэвізам «Deo Vindice». Дадзены варыянт і быў зацверджаны 30 красавіка 1863 года [5, p. 2].

Завяршэнне тэрытарыяльнай арганізацыі краіны адбылося ўжо падчас Грамадзянскай вайны. Першыя баі паўплылі на далейшае развіццё сецэсійнага руху – пачалася другая хваля сецэсіі, якая ўвасобілася у барацьбу за «памежныя» штаты – Дэлэвэр, Мэрыленд, Місуры, Кентукі, Вірджынія. [6, p. 46]. Таксама ішла барацьба і за іншыя штаты Поўдня – Тэнэсі, Паўночная Караліна і Арканзас. Дадзеныя штаты эканамічна яны былі блізкімі да сямі штатаў КША: тут знаходзілася тры чвэрці індустрыяльнай прамысловасці Поўдня, палова коней і мулоў, тры пятых хатняй скаціны і харчовых культур. Акрамя таго, тут жыло палова насельнцтва ад усіх паўднёвых штатаў і адсюль выходзіў шэраг выбітных вайскоўцаў ЗША [2, p. 276]. Відавочна, што абодва бакі былі зацікаўлены ў гэтых штатах: для ўрада Дэвіса далучэнне большасці з іх да Канфедэрацыі значыла ўмацаванне сваіх сіл, а для ўрада Лінкальна – значнае аслабленне сіл праціўніка і ўмацаванне Саюза.

Адразу ж пасля пачатка вайны ўлады ЗША сутыкнуліся з праблемай непадпарадкавання ўлад «памежных» штатаў: іх губернатары адказалі адмоўна на заклік даць войскі для абароны Саюза, што актыўна было абмеркавана ў паведамленні Дж. Дэвіса Часоваму Кангрэсу КША [7, p. 75]. Для Канфедэрацыі важна было забяспечыць сябе перавагу, а гэтыя штаты маглі яе даць. Аднак улады Саюза паспелі правесці шэраг эфектыўных мер: арыштавалі найбольш актыўных прыхільнікаў Канфедэрацыі, увялі ваеннае становішча ў Балтыморы, абмежавалі прав грамадзян штата [8, p. 334–337]. У красавіку федэральныя войскі фактычна акупавалі тэрыторыю гэтага штата [9, p. 44]. Да канца чэрвеня галоўныя сілы прыхільнікаў сецэсіі былі разгромлены, а сітуацыя ў штаце нармалізавалася [10, с. 189].

У Дэлэверы пазіцыі сецэсіяністаў былі слабымі і іх хутка падавілі [10, с. 189]. У Вірджыніі Канвент штата, які арганізаваў прасецэсійны губеранатар, 17 красавіка 1861 года паводле вынікаў галасавання (88 за, 55 супраць) прыняў ардананс аб выхадзе са складу Саюза [2, p. 279]. Аднак графствы заходняй часткі штата не прызналі ўлады КША. 20 чэрвеня у г. Уіліг сабраўся Канвент, які 29 жніўня абвясціў аб стварэнні асобнага штата Заходняя Вірджынія, які ўступіў у ЗША ў 1863 годзе [11, с. 120].

У маі пачалася барацьба за штаты Тэнэсі, Паўночная Караліна і Арканзас. 6–7 мая легістратура штатаў Тэнэсі і Арканзас прынялі ардананнсы аб выхадзе з краіны, а 20-га чысла тое ж самае зрабіў і Канвент Паўночнай Караліны. К пачатку чэрвеня ўсе вышэй пералічаныя штаты аказаліся ў складзе Канфедэрацыі, дзе іх стала 11 [9, p. 42].

Складаная сітуацыя была з Кентукі і Місуры. Калі канфедэратыўныя войскі ўвосені 1861 года занялі частку штата Кентукі, там сабраўся Канвент, які 20 лістапада таго ж



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

года ухваліў ардананс аб сецэсіі. У штаце Місуры 20 красавіка пачалася фактычна тая ж вайна, якая была да вайны ў Канзасе. Вызначыліся два бакі: сецэсіяністы, якіх узначаліў губернатар К. Ф. Джэксан, і юніяністы на чале з Канвента. Перамогу атрымалі юніяністы, губернатар збег са сталіцы да арканзаскай мяжы, дзе 28 кастрычніка прыняла ардананс аб сецэсіі. У Місуры завязалася партызанская барацьба паміж прыхільнікамі КША і Саюза, а выніку чаго легістратура штата 28 кастрычніка прыняла ардананс аб сецэсіі [11, с. 120].

У сваёй прамове да Кангрэса 18 лістапада 1861 года Дж. Дэвіс значную ўвагу надаў сітуацыі вакол апошніх дзвюх штатаў. Паводле яго меркавання, Саюз адмаўляў правы гэтых штатаў на нейтралітэт, асабліва на нейтралітэт Кентукі. Менавіта таму войскі Канфедэрацыі пайшлі «ў гэты штат, каб адбіць ворага і прадухіліць акупацыю некаторых стратэгічна важных кропак, якія ў будучыні далі б ім вялікія перавагі ў вайне – крок, які быў апраўданы, а не толькі па неабходнасці самаабароны з боку Злучаных штатаў, аднак, таксама... каб дапамагчы жыхарам Кентукі» [12, p. 414–415]. У лістападзе 1861 года ў Канфедэрацыю як 12-ты штат ўступіла Місуры, а ў снежні як 13-ты – Кентукі. Аднак у рэальнасці гэтыя штаты знаходзіліся па-за межамі КША, бо ні як не ўплывалі на палітычную сітуацыю ў краіне [13, с. 120].

Такім чынам, вышэй былі разгледжаны асноўныя моманты прыняцця дзяржаўных сімвалаў Канфедэрацыі і прааналізавана заканчэнне яе тэрытарыяльнай арганізацыі. Нягледзячы на тое, што з некаторымі з сімвалаў былі праблемы, можна сцвярджаць, што КША мелі ўсе апазнаваўчыя знакі дзяржавы. Аднак з пашырэннем тэрыторыі краіны сітуацыя аказалася цяжэй – гэты працэс ішоў ужо праз вайну і не стаў вельмі паспяховым для Канфедэрацыі.

**Літаратура**


1 Чечелев, С. В. Государственные символы Конфедеративных Штатов Америки: мифы и реальность / С. В. Чечелев // Вестник Омского Университета: серия «Право». – 2015. – № 2. – С. 14–21.

2 McPherson, J. M. Battle Cry of Freedom: The Civil War Era / J. M. McPherson. – New York : Oxford University Press, 1988. – 909 p.

3 Katcher, Philip R. N. Flags of the American Civil War 1: confederate / Philip R. N. Katcher. – Oxford : Osprey Publishing, 1992. – 48 p.

4 The flags of the Confederate States of America / edit. by United Confederate Veterans. – A. Hoen and Co., 1907. – 12 p.

5 Swanson, G. R. The Great Seal of the Confederacy [Electronic resource] / G. R. Swanson // Confederate Historical Association of Belgium. – Mode of access: http://www.chab-belgium.com/Files%20UK/Articles.htm. – Date of access: 20.03.2017.

6 Brewer, W. M. Lincoln and The Border States / W. M. Brewer // The Journal of Negro History. – 1949. – Vol. 34, №1. – P. 46–72.

7 J. Davis to the Congress of the Confederate States, April 29, 1861 // A compilation of the messages and papers of the confederacy: including diplomatic correspondence 1861–1865: in 2 vol. / ed. by James D. Richardson. – Nashville: United States Publishing Co., 1905. – Vol. 1. – P. 63–82.

8 Davis, J. The Rise and Fall of the Confederate Government: in 2 vol. Vol. 1 / J. Davis. – New York : Thomas Yoseloff, 1958. – 707 p.

9 Carlisle, R. P. Civil War and Reconstruction / R. P. Carlisle. – Infobase Publishing, 2007. – 465 p.

10 Иванов, Р. Ф. Авраам Линкольн и гражданская война в США / Р. Ф. Иванов. – М. : ЭКСМО: Алгоритм-книга, 2004. – 446 с.

11 Исаев, С. А. Конфедеративные Штаты Америки: состав территории и политико-правовое устройство / С. А. Исаев // Americana: сборник научных трудов, посвященный




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

150-летию начала Гражданской войны в Северной Америке. – Волгоград, 2011. – Вып. 12. – С. 108–124.

12 Jefferson Davis to Congress of the Confederate States, Richmond, November 18, 1861 // The Papers of Jefferson Davis: in 13 vol. Vol. 7: 1861 / Edited by Lynda L. Crist and Mary S. Dix. – Baton Rouge : Louisiana State University Press, 1992. – P. 412–421.

13 История США: в 4 т. Т. 1: История США (1607–1877) / под ред. Н. Н. Болховитинова [и др.]. – М. : Наука, 1983. – 688 с.

**УДК 821 – 313.2**

***К. С. Зубарева***

## ТИПОЛОГИЯ ЖЕНСКИХ ОБРАЗОВ В РОМАНАХ-АНТИУТОПИЯХ

*Статья посвящена типологическому анализу женских образов в романах-антиутопиях: «1984» Джорджа Оруэлла, «О дивный новый мир» Олдоса Хаксли и «451 градус по Фаренгейту» Рэя Брэдбери. Произведена попытка выявить основные типы женских образов: женщина-повстанец, женщина-конформист, – как наиболее характерных и значимых для художественного мира романов-антиутопий.*

В сериале «Мир Дикого Запада» Джонатана Нолана главная героиня – Долорес Абернати – озвучивает следующую мысль: «И куда бы мы сбежали? Во внешний мир? За грань? Некоторые видят уродство этого мира, я хочу видеть красоту, но красота – это приманка. Мы в ловушке, Тедди. Всю жизнь мы прожили в этом саду, восхищаясь его красотой, не понимая, что у неё есть цель, назначение, и назначение это – держать нас здесь». Таким образом, Долорес идентифицирует утопическое пространство с библейским раем, а себя и Тедди – с Евой и Адамом.

Следует заметить, что аллюзии на образы Адама и Евы, библейскую легенду о вкушении запретного плода и грехопадении встречаются в романах-антиутопиях регулярно («1984» Джорджа Оруэлла, «О дивный новый мир» Олдоса Хаксли и «451 градус по Фаренгейту» Рэя Брэдбери и др.), что позволяет говорить о данном явлении как тенденции при формировании системы персонажей. Роль Евы, как правило, отводится женщине-повстанцу (Джулия в романе Дж. Оруэлла «1984», Кларисса Маклеллан в романе Р. Брэдбери «451 градус по Фаренгейту»). Также в большинстве романов-антиутопий присутствует образ женщины, принимающей систему и её догмы (Кэтрин в романе Дж. Оруэлла «1984», Милдред в романе Р. Брэдбери «451 градус по Фаренгейту»).

Персонаж романа Джорджа Оруэлла «1984» Джулия – молодая женщина, работающая на партию, но в то же время страстно её ненавидящая: «Джулия не могла помянуть партию, особенно внутреннюю партию, без какого-нибудь словца из тех, что пишутся мелом на заборах. <…> Это было просто одно из проявлений её бунта против партии, против партийного духа» [1]. Именно Джулия видит в Уинстоне потенциального диссидента и становится его возлюбленной.

Кэтрин (жена Уинстона) – антипод Джулии. Супруги Кэтрин и Уинстон больше не живут вместе (разводы партия не одобряла, а раздельное проживание бездетных пар только приветствовала). Уинстон, вспоминая их недолгий союз, негативно характеризует жену: «Уже в самом начале совместной жизни Уинстон решил – впрочем, только потому, быть может, что узнал её ближе, чем других людей, – что никогда не встречал более глупого, пошлого, пустого создания. Мысли в её голове все до единой состояли из лозунгов, и не было на свете такой ахинеи, которой бы она не склевала с руки у партии» [1].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ